жр 3252

Бібліятэка АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ! ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ


# СЯЛЯНСКАЯ ГАЗЕТА

ОРГАН ВІЛЕЙСКАГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 151 Аўторак, 22 Студзеня 1942 г.


ПРАКЛЯЦЦЕ І СМЕРЦЬ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМ ЗАХОПНІКАМ, ІХ ДЗЯРЖАВЕ, ІХ АРМІІ, ІХ „НОВАМУ ПАРАДКУ Ў ЕЎРОПЕ“

(І. В. СТАЛІН).

## НАШЫ ЗАДАЧЫ

### (З даклада Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша І. В. Сталіна НА УРАЧЫСТЫМ ПАСЕДЖАННІ МАСКОЎСКАГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ З ПАРТЫЙНЫМІ І ГРАМАДСКІМІ АРГАНІЗАЦЫЯМІ г. МАСКВЫ 6 ЛІСТАПАДА 1942 г.)

Вайна парвала ўсе пакровы і агаліла ўсе адносіны. Становішча стала да таго яскравым, што няма нічога лягчэй, як вызначыць нашы задачы ў гэтай вайне.

У сваёй гутарцы з турэцкім генералам Эркілет, апублікаванай у турэцкай газеце „Джумхурыет“, людаед Гітлер гаворыць: „Мы знішчым Расію, каб яна больш ніколі не змагла падняцца“. Здаецца, ясна, хоць і глупавата. (Смех). У нас няма такой задачы, каб знішчыць Германію, бо немагчыма знішчыць Германію, як немагчыма знішчыць Расію. Але знішчыць гітлераўскую дзяржаву—можна і патрэбна. (Бурныя апладысменты),

Наша першая задача ў тым іменна і заключаецца, каб знішчыць гітлераўскую дзяржаву і яе натхніцеляў. (Бурныя апладысменты).

У той-жа гутарцы з тым-жа генералам людаед Гітлер прадаўжае: „Мы будзем прадаўжаць вайну да таго часу, пакуль у Расіі не застанецца арганізаванай ваеннай сілы“. Здаецца, ясна, хоць і непісьменна. (Смех). У нас няма такой задачы, каб знішчыць усякую арганізаваную ваенную сілу ў Германіі, бо любы пісьменны чалавек зразумее, што гэта не толькі немагчыма ў адносінах Германіі, як і ў адносінах Расіі, але і нямэтазгодна з пункту гледжання пераможца. Але знішчыць гітлераўскую армію—можна і патрэбна. (Бурныя апладысменты).

Наша другая задача ў тым іменна і заключаецца, каб знішчыць гітлераўскую армію і яе кіраўнікоў. (Бурныя апладысменты).



Гітлераўскія нягоднікі ўзялі за правіла катаваць савецкіх ваеннапалонных, забіваць іх сотнямі, асуджаць на галодную смерць тысячы з іх. Яны гвалтуюць і забіваюць грамадзянскае насельніцтва акупіраваных тэрыторый нашай краіны, мужчын і жанчын, дзяцей і старыкоў, нашых братоў і сясцёр. Яны паставілі сваёй мэтай кінуць у рабства або знішчыць насельніцтва Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі, Малдавіі, Крыма, Каўказа. Толькі нізкія людзі і нягоднікі, якія пазбаўлены чэсці і апусціліся да стану жывёлы, могуць дазволіць сабе такія злачынствы ў адносінах нявінных безабаронных людзей. Але гэта не ўсё. Яны пакрылі Еўропу шыбеніцамі і канцэнтрацыйнымі лагерамі. Яны ўвялі подлую „сістэму заложнікаў“. Яны расстрэльваюць і вешаюць ні ў чым нявінных грамадзян, узятых „пад залог“, з-за таго, што якой-небудзь нямецкай жывёле перашкодзілі гвалціць жанчын або аграбіць абывацеляў. Яны ператварылі Еўропу ў турму народаў. І гэта называецца ў іх „новы парадак у Еўропе“. Мы ведаем вінаўнікоў гэтых злачынстваў, будаўнікоў „новага парадку ў Еўропе“, усіх гэтых новаспечаных генерал-губернатараў і проста губернатараў, камендантаў і падкамендантаў. Іх імёны вядомы дзесяткам тысяч замучаных людзей. Няхай ведаюць гэтыя каты, што ім не ўйсці ад адказнасці за свае злачынствы і не мінаваць караючай рукі замучаных народаў.

Наша трэцяя задача заключаецца ў тым, каб разбурыць ненавісны „новы парадак у Еўропе“ і пакараць яго будаўнікоў.

Такія нашы задачы. (Бурныя апладысменты).

жр 3252



## ТРАФЕІ НАШЫХ ВОЙСК І СТРАТЫ ПРАЦІЎНІКА

### I. ПАД СТАЛІНГРАДАМ

За час наступлення нашых войск пад Сталінградам з 19 лістапада па 11 снежня захоплена ў праціўніка: самалётаў—105, танкаў—1.510, гармат розных калібраў—2.134, мінамётаў--1.714, зэнітных установак—28, кулямётаў—4.175, супроцьтанкавых ружжаў—311, аўтаматаў—звыш 2000, снарадаў--4.196.000, патронаў — звыш 20.000.000, аўтамашын — 7.306, матацыклаў—1.385, радыёстанцый--62, кабеля тэлефоннага--522 кіламетры і іншую вайсковую маёмасць.

К ісходу 11 снежня колькасць палонных павялічылася на 6.400 чалавек. Усяго за час баёў з 19 лістапада па 11 снежня ўзята ў палон 72.400 салдат і афіцэраў праціўніка.

За час баёў з 19 лістапада па 11 снежня нашымі войскамі знішчана 632 самалёты ворага, з іх 353 транспартных самалёты, 548 танкаў, 934 гарматы розных калібраў, 1.946 кулямётаў, 1386 аўтамашын.

За гэты-ж час пад Сталінградам праціўнік страціў толькі забітымі звыш 94.000 салдат і афіцэраў.

### II. НА ЦЭНТРАЛЬНЫМ ФРОНЦЕ

За час баёў з 25 лістапада па 11 снежня на Цэнтральным фронце нашымі войскамі захоплена: танкаў—194, гармат розных калібраў—550, кулямётаў--1.053, вінтовак--каля 7.000, снарадаў--да 300.000, патронаў--7.126000, аўтамашын--920, радыёстанцый--58, складаў розных--43.

За гэты-ж час захоплена ў палон 2.100 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Нашымі войскамі знішчана звыш 200 самалётаў ворага, 416 танкаў, 541 гармату, звыш 1000 мінамётаў, 1230 кулямётаў, 859 аўтамашын.

Па няпоўным данным за час баёў на Цэнтральным фронце немцы страцілі толькі забітымі звыш 75.000 салдат і афіцэраў.

СОВІНФОРМБЮРО.

## Адважныя падрыўнікі

Партызаны-падрыўнікі атрада тав. П. М. сталі майстрамі сваей справы. Кожная міна, кожны кілограм узрыўчаткі падрыўнікамі скарыстоўваецца ўмела, нясе смерць нямецкім акупантам на савецкай зямлі.

За кароткі час падрыўнікі атрада спусцілі пад адкос 4 воінскіх эшалоны, якія следавалі на фронт, разбурана ў 6 мейсцах чыгуначнае палатно.

Паміж станцыямі К. і В. партызаны-падрыўнікі пусцілі пад адкос воінскі эшалон з жывой сілай ворага. Разбіта ушчэнт 5 вагонаў, паравоз і забіта 81 салдат і афіцэраў і 35 ранена. На 36 гадзін на гэтым участку чыгункі быў спынен рух цягнікоў.

У другі раз на Н-скім участку чыгункі падрыўнікі спусцілі пад адкос эшалон з фрыцамі, якія следавалі на фронт. Пры крушэнні было забіта 105 салдат і афіцэраў, многа ранена.

Асаблівую адвагу і знаходлівасць у баявых аперацыях атрада праявілі партызаны: т.т. Р., К., Ч., Міхаіл Б., Нікалай К. Камандаваннем атрада усе яны прадстаўлены да ўзнагароды ордэнамі і медалямі.

Гэта толькі асобные баявыя аперацыі нашага партызанскага атрада. З кожным днём партызанскі рахунак расце, партызаны ўзмацняюць свае ўдары па ворагу. Мы нястомна будзем знішчаць нямецкіх акупантаў да поўнага разгрома фашысцкай Германіі.

Васілій С.—партызан Н-скага атрада.

## Бязлітасна знішчаць нямецкае звяр'ё

Умела і адважна вядуць бязлітасную барацьбу з нямецкімі акупантамі партызаны атрада пад камандаваннем тав. М. Яны не даюць спакою нямецкім акупантам у Н-скіх раёнах Вілейскай області ні днём, ні ўночы.

Вось некаторыя баявыя эпізоды партызан гэтага атрада. У мястэчку С., немцы распалажылі гарнізон паліцэйскіх спецыяльна для барацьбы з партызанамі. Правёўшы дасканалую разведку, партызаны напалі на гарнізон, перабілі і разагналі паліцэйскіх. Потым немцы ўжо адмовіліся распалагаць тут гарнізон і мястэчка кантраліруецца партызанамі.

У мястэчку К. атрад разагнаў нямецкі гарнізон, які налічваў да 100 салдат. Забіта 8 немцаў, спалены гміна і чыгуначная станцыя.

За час свайго дзеяння атрад мае на сваім рахунку 1123 забітых немцаў, 15 паліцэйскіх, забіт вілейскі жандармеры гебітскамісар і яго памочнік, 5 спушчаных пад адкос воінскіх эшалонаў, 18 спаленых маёнткаў з хлебам, 5 чыгуначных і 6 шасейных мастоў.

Баявую славу партызанскі атрад т. М. заваяваў у жорсткіх баях з нямецкімі акупантамі. Партызаны атрада пакляліся ўмножыць гэту славу і біць нямецкае звяр'ё да поўнага ачышчэння совецкай зямлі ад паганай немчуры. Сваю клятву яны выконваюць з чэсцю.

Б. АНДРЭЕЎ.

* * *

У лагер партызанскага атрада пад камандаваннем тав. П. прышлі жыхары вёсак Н-скага раёна Вілейскай вобласці і паведамілі, што на фабрыку П. прыбылі немцы на 3-х аўтамашынах. Партызаны паслалі сваю разведку, і аднача́сова група партызан пайшла на засаду.

Праз некалькі гадзін паказалася машына з немцамі. Партызаны блізка падпусцілі нямецкую машыну і адкрылі агонь. У кароткім баю было забіта 10 і ранена 7 немцаў. Спаліўшы аўтамашыну і забраўшы трафеі, партызаны вярнуліся на сваю базу без страт.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ